ключительное право автора разрешать свободное использование своего произведения без выплаты авторского вознаграждения.

Хотя вопрос установления действительного правообладателя и самого факта нарушения авторских прав в Интернете проблематичен, существуют несколько способов защиты публикаций:

- публикация материала в печатной форме до размещения в Интернет, что позволит установить дату публикации;
- программно-техническая защита;
- свидетельствование у нотариуса даты предъявления документа, содержащего произведение (Закон Республики Беларусь от 18 июля 2004 г. № 305-3 «О нотариате и нотариальной деятельности» (в ред. от 15.07.2009 г.).

***Ю.В. Толмач***

БДЭУ (Мінск)

# АКТ ЛЮБЛІНСКАЙ УНІІ ЯК КАНСТЫТУЦЫЙНАЯ АСНОВА РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

Рэспубліка Беларусь у барацьбе за незалежнасць і нацыянальны суверэнітэт прайшла доўгі шлях. Канстытуцыя нашай краіны, якая грунтуецца на неад'ёмным праве беларускага народа на самавызначэнне, абапіраецца на шматвяковую гісторыю развіцця беларускай дзяржаўнасці. Люблінская унія — адзін з яскравых прыкладаў складанага вырашэння праблем суверэнітэту і самастойнасці Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ), у склад якога ўваходзілі беларускія землі.

Па меркаванню нямецкага палітычнага дзеяча XIX ст. Ф. Ласаля, сутнасць Канстытуцыі ўяўляе сабой «фактычныя адносіны, сілы, існуючыя ў дадзеным грамадстве». Акт Люблінскай уніі — з'яўляецца вынікам гістарычнага ходу падзей XIII–XVI ст.; дакументам, які замацаваў тыя самыя «сілы», якія панавалі ў грамадстве, а таксама асновы дзяржаўнай улады новай краіны — Рэчы Паспалітай.

Рэч Паспалітая як канфедэратыўная дзяржава складалася з Польшчы і Вялікага княства Літоўскага. Яна была створана пасля Люблінскай уніі 1569 г. на падставе практычнага вопыту ўзаемаадносін ВКЛ з Польшчай. Юрыдычна канстытуцыйнай асновай Рэчы Паспалітай стаў акт Люблінскай уніі ад 1 ліпеня 1569 г.

Па акту Люблінскай уніі меркавалася ўтварыць адзіную ўнітарную дзяржаву: «Карона Польская і Вялікае княства Літоўскае ёсць адно непадзельнае і аднароднае цела, а таксама не розная, а адзіная Рэч Паспалітая, якая з дзвюх дзяржаваў і народаў у адзіны народ злучылася і звязалася». Аднак ВКЛ захавала сваю адасобленасць і суверэннасць, страціўшы ўкраінскія землі і беларускае Падляшша на карысць Поль-

шчы. Вялікае княства Літоўскае у складзе Рэчы Паспалітай захавала адасобленасць тэрыторыі, фінансаў, арміі, дзяржаўнага апарату кіравання, сваю прававую і судовую сістэмы. Агульнымі з Польшчай дзяржаўнымі органамі былі Вялікі князь і Вальны сойм. Правы і прывілеі, а таксама высокія пасады цалкам захоўваліся. Дагаворы і саюзы з іншымі краінамі павінны былі заключацца толькі з агульнага ведама і са згоды абодвух народаў.

Трэба заўважыць, што многія беларускія даследчыкі лічаць акт Люблінскай уніі фікцыяй, якой жадалі прыкрыць дзяржаўную здраду Вялікага князя, а таксама рабаўніцтва і насілле польскіх феадалаў і вярхоў каталіцкага духавенства. Так, Я.А. Юхо сцвярджае, што «гэты акт павінен быў стаць праграмай апалячвання і ліквідацыі беларускай і украінскай народнасцяў, знішчэння іх культуры».

Таксама трэба адзначыць, што шэраг пытанняў акт Люблінскай уніі так і не вырашыў. Не была канчаткова размежавана кампетэнцыя маршалкаў, не ўсталяваны курс грошай ВКЛ і Каралеўства Польскага, адпаведны іх рэальнай вартасці. Актуальным заставалася забяспячэнне абароны краіны ад магчымай агрэсіі з боку Маскоўскай дзяржавы. На Люблінскам сойме 1569 г. у цэлым была вызначана структура агульных інстытутаў улады Рэчы Паспалітай, аднак усталяванне механізму існавання дзяржавы падчас бескаралеўя і парадку будучай элекцыі так і не адбылося.

Дзяржаўна-прававыя сувязі паміж ВКЛ і Польшчай пасля 1569 г. будаваліся не на падстве акта Люблінскай уніі, а на ўмовах, што мелі гістарычную выснову, выпрацаваную пры Вялікіх князях Літоўскіх Вітаўце, Казіміры і іх паслядоўніках, пры захаванні адасобленасці кожнай дзяржавы пры адным гаспадары і агульным Сойме. Разам з тым акт уніі паслужыў юрыдычнай падставай стварэння новай агульнай дзяржавы — Рэчы Паспалітай, да кампетэнцыі якой адносіліся міжнародная палітыка і ўзаемная абарона.

***М.В. Тузовская***

Академия управления при Президенте Республики Беларусь (Минск)

## ОСНОВАНИЯ ПРЕКРАЩЕНИЯ БРАКА: ИСТОРИЯ И СОВРЕМЕННОСТЬ

Сохранение брака имеет смысл, только если у супругов была крепкая, морально здоровая семья, основанная на любви и уважении, способная пережить все невзгоды, выпавшие на нее. Свобода развода была одним из основных начал римского брачного права.

В Древнем Риме для того, чтобы брак мог юридически существовать, надо, чтобы все время были в наличии те условия, без которых брак не мог быть заключен. Отсутствие какого-либо из этих условий бы-



Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.
Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by